# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

3 студзеня 2019 г. № 3 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

У мэтах стымулявання і сацыяльнай падтрымкі дзейнасці ў галіне фізічнай культуры і спорту пастанаўляю:

1. За актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць гарманічнаму фарміраванню асобы, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2018 года ў памеры 100 базавых велічынь кожнаму:

Бараноўскай Ірыне Робертаўне, старшаму трэнеру-выкладчыку па спорце аддзялення скачкоў на батуце вучэбна-спартыўнай установы ”Гродзенская спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву № 3“;

Герстэну Барысу Ізідоравічу, намесніку загадчыка аддзела спартыўнага вяшчання закрытага акцыянернага таварыства ”Другі нацыянальны тэлеканал“;

Мазуронак Вользе Сяргееўне, спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы Міністэрства спорту і турызму.

2. Міністэрству фінансаў выдзеліць з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Міністэрству спорту і турызму неабходныя сродкі на выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2018 года.

3. Не абкладаць падаходным падаткам з фізічных асоб сумы спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2018 года, якія выплачваюцца ў адпаведнасці з дадзеным Указам.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

Для правовых актов

10